**Заданні 1 этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”**
**XI клас**
**2021/2022 навучальны год**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Устаўце прапушчаныя склады. Запішыце словы паслядоўна ў адпаведнасці з прыведзенымі значэннямі.

*Максімальны бал – 5.*

Сек’юры..., …фірамб, апла…раваць, бо…стайлінг, мілас…на, пра…ст, ва…н, біфш…кс, раф…нг, …бют.

| | |
|---|---|
| Трыкатажная тканіна з начосам для ўцяплення вопраткі. | |
| Першае выступленне артыста на сцэне. | |
| Хвалебны лірычны верш. | |
| Ахвяраванне бедняку, жабраку. | |
| Кавалак абсмажанай ялавічыны. | |
| Спуск на плытах ці лодках па горных рэках. | |
| Ахова, служба бяспекі. | |
| Сістэма практыкаванняў для паляпшэння фігуры. | |
| Пляскаць у далоні ў знак прывітання ці адабрэння. | |
| Рашучае і катэгарычнае пярэчанне, заявы аб нязгодзе. | |

**Заданне 2.** Арганізатары фестывалю беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі AD.NAK! сцвярджаюць, што ўжыванне рэкламы па-беларуску пашырае мэтавую аўдыторыю рэкламадаўцы як мінімум на 25%. Дапамажыце вытворцам перакласці рэкламу тавараў і іх назвы на беларускую мову.

*Максімальны бал – 11.*

| | |
|---|---|
| Сырок глазированный «Картошка» - в этом продукте объединились самые свежие продукты: натуральный творог, сливочное масло, шоколадная глазурь, которые делают вкус сырков таким неповторимым. | |

**Заданне 3.** Замяніце словазлучэнні такімі сінанімічнымі канструкцыямі, якія адрозніваліся б ад папярэдніх сінтаксічнай сувяззю. Укажыце сінтаксічную сувязь кожнага словазлучэння.

*Максімальны бал – 6.*

| Словазлучэнне | Сінтаксічная сувязь | Словазлучэнне | Сінтаксічная сувязь |
|---|---|---|---|
| фанарныя слупы | | | |
| сябар чалавека | | | |
| напружана дыхае | | | |
| цагляная эстрада | | | |
| працаваць з радасцю | | | |

**Заданне 4.** Устанавіце і запішыце назвы страў і напояў.

*Максімальны бал – 5.*

1. Традыцыйная беларуская страва з каўбасы і мяса, гатунак падлівы для бліноў - ______________________________________________.
2. Традыцыйная страва са смажаных яек - ________________________.
3. Страва, назва якой паходзіць ад слова “халодны”, складаееца з цыбулі, кропу, шчаўя, агуркоў, буракоў або бацвіння - ___________________.
4. Кісламалочны дыетычны прадукт, які ўяўляе сабой густое скіслае малако - ____________________________.
5. Народная назва квасу – традыцыйнага беларускага напою з бярозавага соку - ________________________________________.

**Заданне 5.** Запішыце назоўнікі ў прапанаваных склонавых формах.

*Максімальны бал – 8.*

| **1. Месны склон адзін. лік:** | **2. Творны склон адзін.лік:** |
|---|---|
| задуха (парнасць, духата) - | засень - |
| залатар (майстар) - | шчопаць - |
| замок - | Наталля - |
| запечак - | Косця - |
| засаўка - | косць - |
| збан - | свякроў - |
| звадка - | жаль - |
| звяга - | мужчына - |

**Заданне 6.** Устанавіце нумары з няправільнымі сцвярджэннямі. Утварыце ад гэтых нумароў парадкавыя лічэбнікі і запішыце ў форме творнага склону адзіночнага ліку.

*Максімальны бал – 5.*

**Адказ:** ____________________________________________________________

1. Лічэбнік – часціна мовы, якая абазначае абстрактныя лікі, колькасць, сукупнасць ці парадак прадметаў пры лічэнні, колькасныя прыкметы прадметаў.

2. Паводле значэння і граматычнай структуры вылучаюцца колькасныя, зборныя, парадкавыя.

3. Лічэбнікі два, тры, чатыры маюць родавыя адрозненні.

4. Калі лічнік у дробавым лічэбніку выражаецца словамі *дзве, тры, чатыры,* то назоўнік ужываецца ў назоўным склоне.

5. Лічэбнікі *паўтара* ў спалучэнні з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду і *паўтары* з назоўнікамі жаночага роду ва ўсіх склонах маюць аднолькавую форму і захоўваюць родавыя адрозненні.

6. У сказе *Шэсць на шэсць – трыццаць шэсць* першыя два самастойныя словы – дзейнік, а лічэбнік *трыццаць шэсць* – выказнік.

7. У сказе *Калі памножыць шэсць на шэсць, то атрымаем трыццаць шэсць – шэсць на шэсць* – дапаўненне, а *трыццаць шэсць* – дзейнік.

8. У сказе *Калі памножыць шэсць на шэсць, то атрымаем трыццаць шэсць – шэсць на шэсць і трыццаць шэсць* – дапаўненні.

9. У сказе *На пашпарт патрабуецца фота пяць на шэсць* лічэбнік *пяць* з'яўляецца азначэннем, а лічэбнік *шэсць* – акалічнасцю.

10. Спалучэнне "4,2 метра" ў творным склоне трэба запісаць так: *чатырма цэлымі двума дзясятымі метрамі.*

**Заданне 7.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай форме, складзіце шэсць фразеалагізмаў з кампанентамі-прыназоўнікамі, прыведзенымі ў табліцы. Запішыце складзеныя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

*Максімальны бал – 6.*

**Словы-кампененты для складання фразеалагізмаў**: біцца, бык, гарэць, заклад, зямля, індык, каза, мост, мяняць, нага, пажарны, парадак, паспець, проста, торг.

| | | |
|---|---|---|
| з | "адразу ж, раптоўна, зусім не падумаўшы (рабіць што-н.)" | |
| пад | "хто-н. у небяспечным, пагрозлівым становішчы" | |
| на | "дзейнічаць, рабіць неабдумана, неабачліва; выбіраць горшае" | |
| аб | "спрачацца з абавязкам заплаціць пройгрыш; закласціся ў спрэчцы" | |
| у | "даволі спешна, надзвычай хутка (рабіць, зрабіць што-н.)" | |
| з + на | "няма чаго спяшацца, не спяшайся" | |

**Заданне 8.** Вызначце, якому стылю (афіцыйнаму, навуковаму, публіцыстычнаму, гутарковаму) уласцівы наступныя характарыстыкі.

*Максімальны бал – 6.*

| Характарыстыка | Стыль |
|---|---|
| погляды аўтара выражаюць калегіяльныя погляды ўстановы | |

| | |
|---|---|
| нязмушаная неафіцыйная асабістая маўленчая камунікацыя | |
| фарміраванне грамадскай думкі | |
| паведамленне новых ведаў і доказ іх сапраўднасці | |
| натуральнасць паводзін у час камунікацыі | |
| упарадкаванне прававых адносін паміж людзьмі і дзяржавай | |
| адсутнасць прастамоўных і жаргонных слоў | |
| сацыяльная ацэначнасць матэрыялаў | |
| пераважна вусная форма | |
| аб’ектыўнасць, сістэмнасць, лагічная аргументацыя | |
| устанаўленне сацыяльна нарматыўных паводзін | |
| перавага апавядальных сказаў | |

**Заданне 9.** Запішыце 1) назву вершаванага памеру кожнай страфы; 2) аўтара радкоў.

*Максімальны бал – 4.*

| Вершаваныя радкі | Вершаваны памер | Аўтар |
|---|---|---|
| Спакойнага шчасця не зычу нікому: / Навошта грымотам маланка без грому. | | |
| Ад родных ніў, ад роднай хаты / У панскі двор дзеля красы. | | |
| Між алешын, кустоў, / Дзе пяе салавей, / І шуміць, і грыміць / Срэбразвонны ручэй. | | |
| Вобразы мілыя роднага краю, / Смутак і радасць мая! | | |

**Заданне 10.** Запішыце прапушчаныя тэрміны.

*Максімальны бал – 5.*

| | |
|---|---|
| 1. Невялікая камічная сцэнка, якая разыгралася паміж актамі асноўнага дзеяння спектакля. | |
| 2. Урачысты, узнёслы верш, хвалебная песня ў гонар важнай падзеі, з’явы, асобы. | |
| 3. Апісанне прыроды ў літаратурным творы. | |
| 4. Невялікі лірычны верш напеўнага характару пра каханне. | |
| 5. Верш з 14 радкоў, напісаных ямбам. | |